Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-11-01



# Прафесарскі сход

## Гэтая ўнікальная супольнасць мае намер уплываць на працэсы ўнутры ўніверсітэта і за яго межамі

**На гэтым тыдні Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт адзначыў дзевяноста першы дзень нараджэння. Дата хоць і не круглая, але яшчэ на год набліжае ўніверсітэт да 100-гадовага юбілею, які БДУ мае намер сустрэць абсалютным лідарам. Напярэдадні свята адбылося пасяджэнне прафесарскага сходу — аб'яднання, створанага для таго, каб найбольш аўтарытэтная частка супрацоўнікаў БДУ — дактары навук, прафесары — маглі ўплываць на самыя важныя працэсы і ўнутры ўніверсітэта, і за яго межамі.**

### Якія праблемы трапілі ў поле зроку прафесуры?

Па словах старшыні прэзідыума прафесарскага сходу, акадэміка НАН Беларусі, доктара хімічных навук, прафесара А.І.Лесніковіча, адна з задач сходу — вывучэнне і абагульненне грамадскай (універсітэцкай і знешняй) думкі па пытаннях, якія жыццёва важныя для БДУ. Менавіта з гэтага сход і пачаў сваю работу. Ён быў створаны ў лютым 2012 года. За гэты час адбыліся сустрэчы на факультэтах, прайшло пасяджэнне прэзідыума з удзелам міністра адукацыі С.А.Маскевіча, рэктара РІВШ М.І.Дземчука, прадстаўнікоў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.


Прафесар А.І.Лесніковіч.

У ходзе сустрэч выявілася, што шэраг праблемных пытанняў знаходзяцца па-за кампетэнцыяй універсітэта. Гэта, напрыклад, сацыяльная абарона прафесуры — медыцынскае абслугоўванне, узровень заработнай платы, пенсіённае забеспячэнне. Хаця, лічаць прафесары, пытанне заробку часткова можна вырашыць на ўніверсітэцкім узроўні — праз даплаты вучоным за індэкс цытавання, падрыхтоўку замежных магістрантаў і аспірантаў (паколькі яны ўносяць аплату за навучанне), за званне заслужанага работніка ўніверсітэта, абарону кандыдацкай дысертацыі аспіранта ў тэрмін.

Ёсць нараканні на сістэму менеджменту якасці, якая зараз укараняецца ва ўніверсітэтах: маўляў, яна разлічана на вытворчыя прадпрыемствы, а не на адукацыйныя ўстановы. Прафесары заклапочаны і тым, як не дапусціць дэвальвацыі вышэйшай адукацыі, іх непакоіць пераход на 4-гадовы тэрмін навучання, планы па адмене спецыялізацыі і яе замене практыка-арыентаванымі курсавымі і дыпломнымі праектамі. Крытыка прагучала і на адрас апарату БДУ, дапаможных службаў: затрымкі афармлення камандзіровак, невыкананне прынцыпу "аднаго акна", недаступнасць чыноўнікаў — гэта хоць і тэхнічныя, але вельмі актуальныя рэчы. Увогуле вучоныя лічаць, што апарат чыноўнікаў універсітэта занадта вялікі. Яны адзначаюць таксама, што ў БДУ павінна рэалізоўвацца больш міжнародных навуковых праектаў. Прафесары звярнулі ўвагу на праблемы навучання замежных грамадзян: у часткі з іх ёсць праблемы з рускай мовай, што адбіваецца на якасці адукацыі. Таму прапаноўваецца ўвесці дадатковыя моўныя курсы на платнай аснове, платную пераздачу экзаменаў і залікаў, каб нацэліць замежнікаў на больш інтэнсіўную і адказную вучобу. Даволі востра стаіць пытанне настрыфікацыі дыпломаў кандыдатаў і дактароў навук на тэрыторыі Беларусі і Расіі. Ці патрэбна гэтая працэдура ўвогуле, калі ў краін адзіная адукацыйная і навуковая прастора?

**ДАВЕДКА**
Прафесарскі сход — гэта супольнасць навукова-педагагічных работнікаў комплексу БДУ. Ён створаны для кансалідацыі вучоных і педагогаў, прызваны садзейнічаць фарміраванню пазітыўнай грамадскай думкі, рэалізацыі праграм і планаў універсітэта, забеспячэнню гарантый якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў і кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі, а таксама актыўнаму ўваходжанню БДУ ў сусветную адукацыйную прастору.


Прафесар А.К.Фядотаў.

Вось такім шырокім спектрам пытанняў у далейшым зоймуцца тэматычныя камісіі, якія былі створаны пры прэзідыуме прафесарскага сходу. Напрыклад, пытанні, якія не могуць быць вырашаны толькі на ўзроўні ўніверсітэта, узяла на сябе камісія па ўзаемадзеянні з органамі дзяржаўнай улады. Яе ўзначаліў доктар юрыдычных навук прафесар Р.А.Васілевіч. Менавіта Рыгор Аляксеевіч з'яўляецца галоўным распрацоўшчыкам законапраекта аб унясенні змяненняў у Закон "Аб пенсіённым забеспячэнні", які прадугледжвае захаванне надбавак за ступені і званні пры выхадзе вучонага на пенсію, — гэта, бадай, найважнейшы вынік дзейнасці прафесарскага сходу за восем месяцаў існавання. Праект накіраваны ў Міністэрства адукацыі, і прафесары БДУ спадзяюцца, што гэтая ініцыятыва не застанецца ляжаць пад сукном.

Прафесарская супольнасць мае намер удзяліць увагу школьнай адукацыі. Вучоных непакоіць узровень падрыхтоўкі вучняў сярэдняй школы. Гэтае пытанне бярэ на кантроль камісія па праблемах вышэйшай і сярэдняй адукацыі, сацыяльнай абароне. Яе ўзначаліў прафесар Васіль Іванавіч Стражаў.

Мяркуючы па напрамках дзейнасці камісій, прафесура надае вялікае значэнне супрацоўніцтву з Нацыянальнай акадэміяй навук, укараненню ў вучэбны працэс інфармацыйных тэхналогій, матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню, міжнародным сувязям, узаемадзеянню са сродкамі масавай інфармацыі.

Камісіі — гэта свайго роду рабочыя органы прафесарскага сходу. Наступны іх крок — пошук рашэнняў узнятых праблем.

**Адзін з найважнейшых вынікаў дзейнасці прафесарскага сходу — гэта падрыхтоўка законапраекта аб унясенні змяненняў у Закон "Аб пенсіённым забеспячэнні", дзе прадугледжваецца захаванне надбавак за ступені і званні пры выхадзе вучонага на пенсію. Прафесарская супольнасць спадзяецца, што гэтая прапанова не застанецца ляжаць пад сукном.**

### БДУ прэтэндуе на статус нацыянальнага ўніверсітэта

Рэктар БДУ С.У.Абламейка зазначыў, што моц універсітэта — гэта заслуга вучоных, бо за імі стаяць навуковыя школы, вучні, і ўвогуле іх шматгадовая дзейнасць вызначыла цяперашні выгляд універсітэта.

Унікальнасць прафесарскага сходу БДУ ў тым, што ён знаходзіцца нібы па-над адміністрацыяй: можа ўплываць на кіраўніцтва, прапаноўваць і рэкамендаваць. Таму Сяргей Уладзіміравіч Абламейка, акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар, трымаў перад сходам справаздачу як менеджар.


Прафесар С.У.Абламейка.

Рэктар паведаміў, што зараз ва ўніверсітэце распрацавана палажэнне, згодна з якім плануецца матэрыяльна заахвочваць вучоных з самым высокім індэксам цытавання. Навуковыя кіраўнікі замежных аспірантаў ужо атрымліваюць больш, чым кіраўнікі беларусаў, але ў БДУ шукаюць магчымасць яшчэ павысіць аплату іх працы. Практыкуецца даплата кіраўнікам аспірантаў, калі тыя абаранілі кандыдацкую дысертацыю ў тэрмін.

**Прафесура БДУ прапаноўвае ўвесці даплаты за індэкс цытавання, падрыхтоўку замежных магістрантаў і аспірантаў, за званне заслужанага работніка ўніверсітэта, абарону кандыдацкай дысертацыі аспіранта ў тэрмін. Па словах рэктара С.У.Абламейкі, зараз ва ўніверсітэце распрацавана палажэнне, згодна з якім ужо па выніках 2012 года будуць матэрыяльна заахвочвацца вучоныя з самым высокім індэксам цытавання. Навуковыя кіраўнікі замежных аспірантаў у БДУ ўжо атрымліваюць больш, чым кіраўнікі беларусаў, але адміністрацыя шукае магчымасць яшчэ павысіць аплату іх працы. Практыкуецца таксама даплата кіраўнікам аспірантаў, калі тыя абараняюць кандыдацкую дысертацыю ў тэрмін.**

Па даных на верасень гэтага года, сярэдняя заработная плата ва ўніверсітэце склала 5,150 мільёна рублёў, а сярэдні заробак прафесарска-выкладчыцкага складу — 6,700 мільёна. У зарплаты мноства складнікаў (даплаты за ступень, званне, стаж, факультэцкія і агульнаўніверсітэцкія прэміі і г.д.), таму яна можа вельмі істотна адрозніваецца ў розных прафесараў і вагацца ад 6—7 да 15—20 мільёнаў рублёў. Па словах С.У.Абламейкі, больш за іншых зарабляюць выканаўцы прыбытковых навуковых праектаў.

Рэктар расказаў, што да канца года мяркуецца распрацаваць комплекс мер да святкавання 100-гадовага юбілею ўніверсітэта. Ключавы момант у тым, што да гэтай даты БДУ мае намер падысці ў статусе нацыянальнага ўніверсітэта. У БДУ разумеюць, што не ва ўсіх такія амбіцыі выклічуць станоўчую рэакцыю, але ўпэўнены, што ўніверсітэт гэтага заслугоўвае, бо займае лідзіруючыя пазіцыі ў беларускай вышэйшай школе, умацоўвае аўтарытэт на міжнароднай арэне. Так, паводле рэйтынгу Webometrics, БДУ ўваходзіць у 600 лепшых універсітэтаў свету, а ў Quacquarelli Symonds другі год запар знаходзіцца ў групе з 501 па 550 месца. Белдзяржуніверсітэт лідзіруе з вялікім адрывам ад іншых беларускіх універсітэтаў і па колькасці публікацый супрацоўнікаў у прэстыжных міжнародных часопісах.

Іна НІКІЦЕНКА.
nikitsenka@ng-press.by
Фота Алега ІГНАТОВІЧА.

Іна Нікіценка. Прафесарскі сход